**ГАЙКОЎКА** – вёска ў былым Дзяражненскім сельскім Савеце (да 1989 г.), за 17 км на ПдЗ ад Касцюковіч і ад чыгуначнай ст. Камунары на лініі Крычаў-Сураж, 177 км ад Магілёва, на р. Дзяражня (прыток р. Бесядзь). Транспартныя сувязі па прасёлачнай дарозе і далей па аўтадарозе Краснаполле – Хоцімск.

Назва вёскі паходзіць ад прозвішча ўладальніка вёскі ў 18 ст. Гайкова.

Археалагічны помнік - паселішча, што размешчана побач з вёскай і датуецца 5 тысячагоддзем да н. э., сведчыць, што гэтую мясцовасць людзі засялілі яшчэ ў глыбокай старажытнасці. Вёска вядома з 18 ст. У 1762 г. сяло, млын, шляхецкая ўласнасць, у Мсціслаўскім ваяводстве. У 1777 г. у Чэрыкаўскім павеце Магілёўскай губерні.У 1799 г. 10 двароў, 67 жыхароў.

Вёска была ўладаннем суддзі Гайкова. У 19 ст. вёска пры р. Дзяражня ў Клімавіцкім павеце Магілёўскай губерні. Паводле рэвізіі 1833 г., 98 сялянскіх душ, 49 жыхароў мужчынскага полу. Належала памешчыцы Саламеі Гайковай. Па рэвізскіх матэрыялах 1858 г. 85 жыхароў. У 1865 г. меўся вадзяны млын і карчма, маёмасць стацкага саветніка Н. Валюжыніча, які ў 1870 г. заснаваў сукнавальню (меў даход 70 руб.). Жыхары былі прыхаджанамі праваслаўнага Беладубраўскага прыхода Ражства-Багародзіцкай царквы. У 1897 г. – 30 двароў, 221 жыхар, у Студзянецкай воласці.У 1909 г. 34 двары, 262 жыхары. З 20.08.1924 г. вёска ў Красніцкім сельсавеце Касцюковіцкага раёна Калінінскай, з 09.06.1927 г. Магілёўскай акругі. Вясковыя дзеці наведвалі школу ў в. Мялоўка за 0,5 км. У 1926 г. 24 двары, 134 жыхары. У 1930 г. быў створаны калгас “Новае жыццё”, працавалі кузня, турбінны млын. З 05.12.1931 г. вёска ў Дзяражненскім сельсавеце. Паводле перапісу 1959 г. – 296, у 1970 г. – 184 жыхары. У 1986 г 40 гаспадарак, 82 жыхары, у складзе саўгаса “Печанеж”. Крывалінейная вуліца была забудавана пераважна двухбакова драўлянымі сялянскімі хатамі.

У 1989 г. злілася з в. Печанеж, пахавана ў 2012 годзе.